URZĄD DO SPRAW CUDZOZIEMCÓW

**Дзеці, якія знаходзяцца ў працэсе працэдур, звязаных з атрыманнем статусу бежанца, вяртаюцца ў школы**

**З 31 траўня гэтага года вучні вяртаюцца да стацыянарнага навучання ў школах. Гэта датычыць таксама дзяцей, якія знаходзяцца ў працэсе працэдуры, звязанай з прадастаўленнем міжнароднай аховы ў Польшчы. У гэты час іх амаль 800, з якіх 258 пражывае ў цэнтрах да бежанцаў. Яны ходзяць у 248 школ, на такіх жа ўмовах, як і польскія дзеці.**

Падчас дыстанцыйнага навучання дзеці, якія знаходзяцца ў працэсе прадастаўлення статусу бежанца, маглі карыстацца падтрымкай працаўнікоў Кіравання па справах іншаземцаў. Яны дапамагалі бацькам і дзецям, падаючы правілы дзеяння праграм і дадаткаў, якія выкарыстоўваліся да дыстанцыйнага навучання, а таксама асіставалі ў кантактах са школамі. Ува ўсіх цэнтрах забяспечаны доступ да Інтэрнэту, а таксама wi-fi. У цэнтрах, у якіх была такая неабходнасць, былі арганізаваны дадатковыя месцы для дыстанцыйнага навучання.

Як польскія вучні, гэтак і дзеці-іншаземцы, атрымлівалі ў школах кампутарнае абсталяванне, што дазваляла ўдзельнічаць у ан-лайн занятках. Абсталяванне звычайна ўзычалася напракат на падставе ўмоваў, складзеных з бацькамі. У сувязі з гэтым, калі пакідаецца ранейшае месца пражывання або змяняецца школа, тады бацькі абавязаны вярнуць абсталяванне ў школу.

Іншаземцы, якія імкнуцца атрымаць у Польшчы міжнародную ахову, могуць карыстацца сацыяльнай дапамогай, якая даецца Кіраваннем па справах іншаземцаў, а адукацыя з'яўляецца істотным элементам такой падтрымкі. Кіраванне дае магчымасць удзелу ў занятках польскай мовы, а таксама ў занятках, якія падрыхтоўваюць новапрыбылых вучняў да пачатку заняткаў у польскіх школах. Апроч таго Кіраванне па справах іншаземцаў дае вучням падручнікі, а таксама патрэбныя школьныя прыналежнасці.